Саверчанка І.В. Беларуская літаратура XI – XIX стст.: гістарычныя і тэарэтычныя аспекты вывучэння // Беларуская пісьмовая спадчына ў кантэксце еўрапейскага культурна-гістарычнага працэсу XI – XIX стагоддзяў: вытокі, традыцыі, уплывы. Мн., 2010. С. 3 – 13.

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук

**Беларуская літаратура XI – XIX стст.:
гістарычныя і тэарэтычныя аспекты вывучэння**

Беларуская літаратура XI – XIX стст. – неацэнны духоўны набытак нацыі. Творчая спадчына Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, Сымона Буднага, Іпація Пацея, Лаўрэнція Зізанія, Мялеція Сматрыцкага, Афанасія Філіповіча, Сімяона Полацкага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Кастуся Каліноўскага і Францішка Багушэвіча – найвялікшая гісторыка-культурная каштоўнасць дзяржавы і народа.

Без глыбокага і ўсебаковага асэнсавання беларускага пісьменства ранейшых часоў немагчыма аб’ектыўна раскрыць заканамернасці развіцця нацыянальнай літаратуры, выявіць сістэму вобразатворчасці і эвалюцыю жанравых форм.

У канкрэтна-навуковым плане яе вывучэнне дазваляе ўдакладніць мастацка-эстэтычныя вартасці асобных помнікаў літаратуры, вызначыць ролю асобных майстроў слова ў гісторыі прыгожага пісьменства, акрэсліць творчыя дамінанты пісьменнікаў. Паўнавартаснае асэнсаванне літаратуры XI – XIX стст. дапамагае высветліць сапраўдныя маштабы семантычна-вобразнай разнастайнасці беларускай літаратуры, выявіць яе тэматычную напоўненасць, праблемную глыбіню, мастацкія метады і тыпы стыляў.

Беларуская літаратура XI – XIX стст. – выключна адметная знакавая сістэма, адна з галоўных форм мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Яна ўтрымлівае ўнікальную інфармацыю пра духоўнае жыццё чалавека даўніх часоў, выдатным чынам адлюстроўвае светапогляд ранейшых пакаленняў, эстэтычныя густы і культуру грамадства. Менавіта таму, літаратура і помнікі пісьменства з’яўляюцца важнай, незаменнай крыніцай спасціжэння фундаментальных складовых духоўна-культурнай эвалюцыі беларускай нацыі.

У беларускай літаратуры XI – XIX стст. найбольш поўна выявіліся інтэлектуальныя пошукі і памкненні беларускага народа. У ёй знайшлі адлюстраванне міжасабовыя і міжэтнічныя дачыненні, адбіліся шматузроўневыя праявы суіснавання буйных рэлігійных кангламератаў, міждзяржаўныя стасункі, усе шэрагі і базавыя кампаненты грамадскай

цывілізацыі. Даўняя літаратура ў гэтым плане дае выдатны ўзор пошуку і выбару эфектыўных сродкаў дзеяння, падказвае механізмы і шляхі выпрацоўкі прынцыпаў сучаснага «дыялогу», выступае адным з інструментаў, пры дапамозе якога мажліва «мяккае» пераадоленне супярэчнасцяў і крызісаў, што непазбежна ўзнікаюць пры развіцці сучаснага грамадства.

Нягледзячы на пэўныя здабыткі ў вывучэнні нацыянальнай пісьмовай спадчыны, перад сучасным нацыянальным літаратуразнаўствам паўстае комплекс тэарэтычных, гісторыка-крыніцазнаўчых, кампаратывісцкіх, археаграфічных і тэксталагічных праблем.

Найбольш складанае і дыскусійнае пытанне гісторыі і тэорыі літаратуры – *вытокі* нацыянальнага прыгожага пісьменства, пачатковы этап развіцця і характар станаўлення беларускай мастацкай літаратуры.

Наяўнасць зусім рэліктавых тэкставых адзінак – “Сказання пра запрашэнне варагаў” і “Занатовак пра Рагнеду” даюць падставы гаварыць пра зараджэнне беларускай літаратуры ўжо ў другой палове X ст.

Семантыка “Сказання пра запрашэнне варагаў” паказвае, што яно верагодна было створана ў часы полацкага князя Рагвалода. Летапіс сведчыць, што Рагвалод быў запрошаны “з-за мора” і княжыў у Полацку акурат у другой палове X ст. Аповедам пра першых князёў запрошаных з-за мора, аўтар “Сказання…” хутчэй за ўсё якраз і імкнуўся абгрунтаваць гістарычнае права варажскага князя Рагвалода на ўладу ў Полацку, а таксама пацвердзіць яго магчымасці параднення з кіеўскімі князямі. Рагвалод сапраўды імкнуўся да дынастычнага саюза з кіеўскімі князямі, нават рыхтавалася вяселле яго дачкі Рагнеды з кіеўскім князем Яраполкам.

Другі твор “Занатоўкі пра Рагнеду” відаць былі напісаны ў канцы X ст. Ён утрымлівае унікальны сюжэт аб тым, як ноўгарадскі князь Уладзімір хацеў узяць шлюб з Рагнедай і здабыць Полацкую зямлю. Рагнеда грэбліва адмовіла “сыну рабыні”. У адказ Уладзімір захапіў Полацк, забіў Рагвалода і яго двух сыноў, а Рагнеду прымусам узяў у жонкі. У творы распавядаецца пра няўдалую спробу Рагнеды забіць соннага Уладзіміра ў перыяд жыцця ў Кіеве ў другой палове X ст. Твор заканчваюцца звесткамі пра высылку Рагнеды ў Заслаўе разам з сынам Ізяславам і нічога не паведамляецца, што здарылася з гераіняй пазней. Гэты факт якраз і дае падставы адносіць напісанне тэкста да канца X ст. “Занатоўкі пра Рагнеду” – не шэраговае летапісные паведамленне, а несумнена літаратурны твор, з прыгодніцкім сюжэтам і яркімі персанажамі. Ён насычаны драматычнымі дыялогамі герояў, выдатным чынам адлюстроўвае эпоху, аб’ёмна раскрывае паводзіны і пачуцці прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя.

З’яўленню першых літаратурных помнікаў на Беларусі папярэднічаў амаль стогадовы перыяд развіцця славянскага пісьменства з моманту яго стварэння Кірылам і Мяфодзіем у IX ст. Відавочна, што гэта даволі значны час, цалкам дастатковы, каб былі створаны неабходныя перадумовы для фармавання ўласна мастацкай літаратуры. Аднак, пытанне вытокаў беларускай літаратуры, усё ж патрабуе дадатковага і ўсебаковага вывучэння. Варта, пры гэтым прыгадаць працу Д.С.Ліхачова “Развитие русской литературы X – XVII вв. Эпохи и стили” [2], у якой вучоны палічыў мэтазгодным аднесці ўзнікненне арыгінальнай рускай літаратуры менавіта да X ст., хоць агульнавядома, што славянская каланізацыя адбывалася з захаду на ўсход, а цэнтры пісьменства ў Ноўгарадзе і Маскве з’явіліся пазней, чым у Полацку і Тураве.

Важнейшае пытанне – навуковая *перыядызацыя* беларускай літаратуры. Відавочна, у яе аснову павінны быць пакладзены мастацка-эстэтычныя крытэрыі.

Сучасны гісторыка-тэарэтычны досвед дазваляе сцвярджаць, што пачатковы этап развіцця беларускай літаратуры – перыяд *Готыкі*. Ён ахоплівае час ад глыбокай старажытнасці да XV ст. На зары станаўлення беларускай літаратуры пісьменнікі імкліва пераймалі досвед і майстэрства візантыйскіх і заходне-раманскіх аўтараў, шліфавалі ўласна літаратурную тэхніку, вучыліся выбудоўваць кампазіцыю і сюжэт, асвойвалі складаныя жанравыя сістэмы. Для гатычнай літаратуры характэрна ананімнасць, ёй уласціва асаблівая стрыманасць і лаканізм, што цалкам адпавядала эстэтычным уяўленням часу. Унутраны стрыжань гатычнай літаратуры Беларусі – урачыстае гучанне мастацкага слова.

У XVI ст. беларуская літаратура, як выразна паказвае комплекс мастацка-эстэтычных дамінантаў, уступіла ў перыяд *Рэнесансу*. Эпоха Рэнесансу характарызуецца секулярызацыяй мастацкай свядомасці. У гэты час філасофія богашукальніцтва саступае месца ідэалогіі антрапацэнтрызму. У мастацкай творчасці на першае месца выйшлі асоба і індывідуальнасць, адбылося сапраўднае адкрыццё чалавека, пісьменнікі стварылі гімн розуму і апелі прыгажосць быцця. З’яўленне друкаванай кнігі і яе масавае пашырэнне сталіся сапраўднай інфармацыйнай рэвалюцыяй. Для майстроў мастацкага слова адкрыліся небывалыя магчымасці камунікавання з шырокімі коламі чытачоў. Беларускія пісьменнікі-гуманісты напоўніцу скарысталі спрыяльныя тэхналагічныя магчымасці. У першыя дзесяцігоддзі XVI ст. Ф.Скарына пераклаў і надрукаваў кнігі “Біблії”. У 1562 г. у Нясвіжы на беларускай мове быў выдадзены славуты “Катэхізіс” С. Буднага. На працягу XVI ст. ў друкарнях Брэста, Вільні, Нясвіжа, Любчы былі апублікаваны шматлікія празаічныя і вершаваныя творы.

Трэці этап, які выразна выявіўся ў беларускай літаратуры, – эпоха *Барока* – універсальны стыль еўрапейскай культуры XVII ст. Яркімі прадстаўнікамі беларускага літаратурнага Барока з'яўляліся: Г. Пельгрымоўскі, М.Сматрыцкі, Т.Яўлевіч, А.Філіповіч, Ф.Баравік, С.Косаў, К.Транквіліён-Стаўравецкі, І.Галятоўскі, Ф.Утчыцкі і С.Полацкі.

Для беларускага Барока характэрна гармонія пачуццяў і формы, імкненне спалучыць рацыянальнае з ірацыянальным. Пад уздзеяннем барочнай эстэтыкі ў беларускай літаратуры атрымала росквіт эмблематычная паэзія, з'явіліся вершаваныя пасольскія дзённікі, узніклі мясцовыя хронікі, прыватныя дыярыушы і ўспаміны. Адзін з галоўных жанраў мастацкай літаратуры перыяду Барока – узнёслыя панегірыкі. Майстэрству стварэння панегірыкаў навучалі ў тагачасных езуіцкіх калегіях, падручнікі па рыторыцы прадугледжвалі авалоданне панегірычнымі жанрамі. Захавалася некалькі дзесяткаў панегірыкаў пераважна на польскай і лацінскай мовах. Праз панегірыкі беларускія пісьменнікі авалодвалі майстэрствам стварэння станоўчага героя.

У перыяд Барока з'явіліся квяцістыя надмагільныя словы і "казанні на смерць". У творах гэтага жанру прасочваўся жыццёвы шлях знакамітай асобы – магната або князя. Майстры слова, засяроджваючыся на характарыстыцы учынкаў і спраў выдатнай асобы, імкліва асвойвалі тэхніку раскрыцця эвалюцыі персанажаў, станаўлення характару герояў.

На мастацка-стылявым узроўні творы перыяду Барока адрозніваюцца асаблівай квяцістасцю і вычурнасцю, экспрэсіўнасцю і экзальтаванасцю. Пісьменнікі Барока значную ўвагу надавалі мастацкай дэталі, пачалі фіксаваць шматлікія дробязі, апісваць вопратку герояў і побытавыя рэчы.

У XVIII ст. на Беларусі пачаўся перыяд *Асветніцтва.* У гэты час адбываўся пераход ад старажытнай літаратуры да новай, што выяўлялася на ўсіх мастацкіх узроўнях – выбары жанравых формаў, характары вобразатворчасці, пабудове сюжэтаў, прынцыпах адлюстравання рэчаіснасці. Галоўная мастацка-эстэтычная тэндэнцыя палягала на тым, што літаратура паступова вызвалялася ад рэлігійнай праблематыкі, на першае месца выходзілі свецкія тэмы і агульнаграмадскія праблемы.

Важнейшы этап у развіцці нацыянальнай літаратуры – перыяд *Рамантызму*, яркімі прадстаўнікамі якога з'яўляюцца Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Арцём Вярыга-Дарэўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч [4; 5]. Вызначальныя рысы беларускай літаратуры Рамантызму – зварот да народных традыцый і фальклору, павышаная цікавасць да міфаў і містычных з'яваў, апрацоўка казачных сюжэтаў, легенд і паданняў.

Фенаменальны ідэйна-эстэтычны накірунак беларускай літаратуры – *Рэалізм*, які сфармаваўся ў другой палове XIX ст. Да яго належыць спадчына

выдатнага пісьменніка-публіцыста Кастуся Каліноўскага, творы Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны, Фелікса Тапчэўскага, Адама Гурыновіча і Альгерда Абуховіча. Пісьменнікі-рэалісты выступілі з крытыкай існуючага грамадскага ладу, адкрыта заявілі пра неабходнасць сацыяльных і палітычных зменаў. У якасці галоўных персанажаў іх твораў часцей пачалі фігураваць простыя людзі – сяляне і местачкоўцы. Пісьменнікі рэалістычнага напрамку акрэслілі прынцыпы новай эстэтыкі і сфармулявалі асноўныя пастулаты нацыянальнага адраджэння.

Змены мастацкіх эпох і стыляў на працягу XI – XIX стст., – праява натуральнага развіцця нацыянальнай літаратуры, вынік ідэйна-эстэтычных пошукаў беларускіх майстроў слова і эвалюцыі мастацка-выяўленчых сродкаў. Трансфармацыі топасаў лагічна прыводзілі да ўзнікнення новых літаратурных эпох, стыляў і напрамкаў.

Пры комплексным вывучэнні мастацка-эстэтычных эпох на сучасным этапе надзвычай важна выявіць сутнасць і адметнасці кожнай з іх, раскрыць стылявыя пошукі пісьменнікаў, прадставіць разгорнутыя, навукова карэктныя характарыстыкі галоўных творчых метадаў.

Пры вывучэнні беларускай літаратуры XI – XIX стст. надзвычай важны *кампаратывісцкі* падыход. Фарміраванне адметнай эстэтыкі і мастацкага стылю пісьменнікаў на працягу стагоддзяў адбывалася пад уздзеяннем не толькі нацыянальнага творчага асяроддзя, але і знешніх уплываў. Кожны з майстроў слова аб’ектыўна знаходзіўся пад моцным ўздзеяннем мастацка-эстэтычных дасягненняў і здабыткаў іншых культур і цывілізацый. Беларуская літаратура ва ўсе перыяды яе развіцця адчувала заўважны ўплыў Антычнасці, грэка-візантыйскай літаратуры і заходне-раманскай мастацкай культуры.

Узаемаўплывы і ўзаемадзеянні – ключавы элемент развіцця нацыянальнай і сусветнай літаратуры. Іх даследаванне дазваляе аб’ектыўна выявіць комплекс мастацка-эстэтычных элементаў, пад уздзеяннем якіх адбывалася фарміраванне буйнейшых майстрой мастацкага слова. Да ліку найбольш значных і каштоўных ў метадалагічным плане кампаратывісцкіх даследаванняў несумненна належаць “Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей” [1]. Інфармацыйнай насычанасцю харакратызуецца кампаратывісцкі зборнік: Weissrussland und der Westen (Беларусь і захад) (Dresden, 1998) на нямецкай, англійскай і рускай мовах [6].

Кампаратывістыка – найлепшы сродак раскрыцця мастацка-эстэтычнага феномена літаратурнай творчасці, пачынаючы ад старажытнасці і да нашага часу. На сучасным этапе найбольш актуальная задача – акрэсліць канкрэтныя формы сувязяў і ўзаемадзеяння беларускай літаратуры XI – XIX стст. з літаратурамі іншых краін на ўсіх узроўнях паэтыкі. Вельмі істотна

вызначыць, у якой ступені ўзаемасувязі спрыялі развіццю нацыянальнага прыгожага пісьменства, садзейнічалі фарміраванню ўласна мастацкіх вартасцяў беларускай літаратуры.

На працягу стагоддзяў беларускае прыгожае пісьменства развівалася ў шчыльнай узаемасувязі з *сацыяльнымі* і грамадска-палітычнымі працэсамі. На старонках літаратурных твораў знаходзілі адлюстраванне важнейшыя грамадскія працэсы і з’явы: войны, паўстанні, міжнародныя адносіны, унутрыпалітычныя падзеі – канфлікты паміж князямі, шляхецкія соймы, царкоўныя саборы.

Літаратура зазнавала моцны ўплыў соцыума і ў сваю чаргу аказвала ўздзеянне на грамадскія працэсы і духоўнае жыццё асобы. Лепшыя майстры мастацкага слова ўплывалі на фарміраванне духоўных ідэалаў грамадства, уяўленні пра дабро і зло, прыгожае і высокае. Пісьменнікі-інтэлектуалы – Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны, Леў Сапега, Францішак Багушэвіч – прапанавалі ўласныя канцэпцыі развіцця грамадства, мадэлі сацыяльнага паразумення і прынцыпы міжнацыянальнага дыялогу. Яны адстойвалі ідэі гуманізму, даводзілі неабходнасць усеагульнай адукацыі, усталявання прававой дзяржавы, патрабавалі павагі да грамадзянскіх правоў асобы.

Для многіх твораў беларускай літаратуры XI – XIX стст.  характэрны непрыхаваны дыдактызм, павучальнасць і маралізатарства. Майстры мастацкага слова шчыра дбалі пра ўдасканаленне грамадскіх дачыненняў, інтэлектуальнае і духоўнае развіццё чалавека.

Нацыянальнаму літаратуразнаўству яшчэ належыць выявіць велізарны інтэлектуальны досвед даўняй літаратуры, паказаць ва ўсім аб’ёме багатыя ідэйна-эстэтычныя набыткі пісьменнікаў мінулага і ступень іх уплыву на грамадства.

Асноватворнае, ключавое пытанне гісторыі і тэорыі літаратуры – ўзровень *мастацкасці* беларускага прыгожага пісьменства XI – XIX стст. Надзвычай важна выявіць яго ўласна літаратурны і вобразна-эстэтычны патэнцыял, ролю ў духоўна-культурным жыцці.

Беларускія майстры слова паспяхова асвоілі практычна ўсе *роды, віды і жанры*, уласцівыя еўрапейскай літаратуры таго часу.  Сярод *празаічных* жанраў пераважалі: сказанні, словы, жыціі, пахвалы, прамовы, павучанні, пасланні, прыпавесці, напаміны, аповесці, летапісы і хронікі, дыярыушы і мемуары. У старажытны перыяд узнікла *сатырычная* літаратура, найбольш выдатныя ўзоры якой – “Прамова Мялешкі”, “Ліст да Абуховіча” і “Прамова Русіна”. Прадметам іх адлюстравання стала сялянская і шляхецкая культура. У літаратуры XVIII ст. назіралася паглыбленне карнавалізацыі. З’явіліся асобныя папулярныя выданні, як напрыклад “Торба смеху” Караля Жэры,

якая цалкам складалася з фацэцый, запісаных аўтарам на Беларусі. На старонках сатырычных і гумарыстычных твораў падаваліся разнастайныя камічныя здарэнні і забаўныя гісторыі, анекдоты і пацешныя показкі. Забаўляльныя падзеі ўзбагачалі літаратуру новымі сюжэтамі і тэмамі.

Найбольш значнай падзеяй літаратурнага жыцця XIX ст. сталіся празаічныя творы Ф.Багушэвіча (“Тралялёначка”, “Сведка”, “Палясоўшчык”, “Дзядзіна”).

Вельмі значныя набыткі ў духоўнай і свецкай *паэзіі*. У ёй пераважалі малітвы, эпіграмы на гербы, рыцарскія паэмы, ляманты, вершаваныя панегірыкі. У XVIII ст. на хвалі Асветніцтва зарадзілася антыклерыкальная паэзія, выдатныя ўзоры якой – “Песня пра Лазара”, “Аб страшным судзе”, “Уваскрэсенне Хрыстова”. З’явіліся героіка-патрыятычныя творы, найбольш значныя з якіх – “Польшча квітнее лацінай…” і “Песня беларускіх жаўнераў 1794 года”.

У XIX ст. узніклі вершы стылізаваныя пад народныя песні, парадыйная і гумарыстычныя творы, вершаваныя паэмы і гутаркі: “Панская ласка”, “Скажы, вяльможны пане”, “Тэатр”, “Праўда”, “Вясна, гола, перапала”, “Вось цяпер якілюд стаў”, “Гутарка ў карчме”, “Гутарка Данілы са Сцяпанам”, “Сход”, “Панаманія”, “Гутарка Кандрата да свайго брата” “Плынуць вятры”, “Гутарка старога дзеда”, “Крыўда і праўда”, “Надмагільны надпіс губернатару Літвы”. У вершаваных ананімных творах XIX ст. дамінавала сацыяльная праблематыка, падкрэсліваліся цяжкасці сялянскага жыцця і класавы антаганізм.

У паэмах “Энііда навыварат” і “Тарас на парнасе” вельмі яскрава выявіліся парадыйнасць і бурлескнасць. Заснавальнік новай беларускай літаратуры В.Дунін-Марцінкевіч стварыў выдатныя вершаваныя аповесці – “Гапон”, “Вечарніцы”, “Купала”, “Шчароўскія дажынкі”, “Травіца брат-сястрыца”, “Злая жонка”, “Халімон на каранацыі”. Моцнае грамадзянскае гучанне набыла паэзія Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны і Адама Гурыновіча.

Неверагодна багатая нацыянальная *публіцыстыка*. Яна мела разгалінаваную, мнагастайную жанравую сістэму, якая ўключала звыш 10 розных тыпаў: палемічныя трактаты (“адказы”, “аспрэчанні”, “абароны”, “апалогіі”, “пярэчанні”, “пасланні”, “эпісталы” і “водпісы”); аналітычныя творы («навукі», «вучэнні», “фундаменты”, «гутаркі», «размовы», “дыялогі”, «разважанні», «філасофіі», “вызнанні”, “сімвалы”, «тэзісы» і «артыкулы»); экзэгетычныя творы (“тлумачэнні”, “прыпіскі”, “надпісы” да раздзелаў біблейных кніг); урачыстыя словы і казанні; катэхізісы, дыдаскалі і павучанні; сінкрэтычныя творы (“апісанні”, “рэляцыі”, “адпіскі” “сінопсісы”); казанні на пахаванні («на пагрэб»); адозвы, перасцярогі,

звароты і заявы; пратэстацыі і суплікі; прамовы і словы на соймах, трыбуналах, саборах, дыпламатычных раундах; прадмовы, пасляслоўі і прысвячэнні.

Вяршыннай праявай нацыянальнай публіцыстыкі XIX ст. стала “Мужыцкая праўда” і “Пісьмо з-пад шыбеніцы” К.Каліноўскага. Рускамоўнымі паводле формы і глыбока нацыянальнымі паводле зместу з’яўляюцца публіцыстычныя творы Данілы Баравіка “Пісьмы пра Беларусь” і Шчырага Беларуса “Пасланне да землякоў-беларусаў”, а таксама публікацыі часопіса “Гоман”.

У XVI ст. на Беларусі з’явілася *драматургія*, росквіт якой прыпаў на XVII – XVIII стст. Найбуйнейшы драматычны твор – “Камедыя” К.Марашэўскага. Велізарную мастацка-эстэтычную каштоўнасць уяўляюць беларускія інтэрмедыі. Найбольш значныя сярод інтэрмедый перыяду Барока і Асветніцтва – “Чорт Асмалейка”, “Іван і Царкоўны Сторож”, “Селянін і Студэнт”, “Селянін і Вучань-уцякач”, “Селянін на споведзі”, “Мацей і Доктар-шарлатан”. Тагачасныя інтэрмедыі – гэта, як правіла, жартаўлівыя сцэнкі, якія ставіліся ў прамежках паміж актамі панарамных класічных драм. Іх эстэтычнае прызначэнне зводзілася да таго, каб развесяліць гледача, зняць напружанне ад прагляду сур’ёзных пастановак на рэлігійна-павучальныя тэмы. Сюжэт твораў будаваўся на побытавых сітуацыях, часам гіпербалізаваных, у якія траплялі героі. У аснове канфлікту інтэрмедый – нечаканыя здарэнні, недасведчанасць герояў, непаразуменні паміж дзеючымі асобамі, сутыкненні інтарэсаў.

Зараджэнне нацыянальнай драматургіі новага часу лучыцца з імем В.Дуніна-Марцінкевіча, аўтара “Ідыліі”, “Пінскай шляхты” і “Залётаў”.

На сучасным этапе ў галіне жанразнаўства надзвычай актуальная задача – раскрыць паэтыку асобных родаў, відаў і жанраў беларускай літаратуры, прасачыць іх эвалюцыю і якасныя змены ў часе. Вельмі важна – рэканструяваць асаблівасці архітэктонікі і кампазіцыйнай будовы твораў, паказаць спецыфіку сюжэтных ліній і дамінуючыя творчыя матывы.

Беларуская літаратура XI – XIX стст. мела значныя набыткі ў сферы стварэння *характараў і персанажаў.* Пісьменнікаў пачатковага перыяду развіцця літаратуры перадусім цікавілі заслугі асобы перад радзімай і перад грамадствам. У мастацкіх творах ўзносіліся самаахвярныя героі і змагары за Айчыну і веру, гнеўна асуджаліся здраднікі, баязлівцы і клятваадступнікі.

У нацыянальнай літаратуры вельмі рана з’явіўся *рэфлексуючы* чалавек, які імкнуўся да ўсебаковага асэнсавання ўласных паводзінаў і ўчынкаў, разважаў пра сапраўдныя і ўяўныя каштоўнасці, дбаў пра ўласнае добрае імя ў гісторыі. У высокамастацкіх малітвах Кірылы Тураўскага і “Жыціі Еўфрасінні Полацкай” загучаў пранізлівы голас сумлення, з’явіліся рэфлексія

і самааналіз. Лірычны герой малітваў Кірылы Тураўскага – наогул фенаменальная з’ява ўсё славянскай літаратуры. У ім арганічна ўвасабляюцца неабсяжная інтэлектуальнасць і высокая духоўнасць. Герой малітваў усім сэрцам прагне дасканаласці і свабоды, духоўнага ўзвышэння, гармоніі з прыродай і космасам, грамадскага сумоўя і сацыяльнага паразумення, добрай славы, сэнсоўнага зямнога жыцця і несмяротнасці.

На старонках камедыйных і сатырычных творах паўсталі *камічныя* характары, пачалі дзейнічаць абагульненыя персанажы, прадстаўнікі шырокіх народных мас – Селянін, Ксёндз, Вучань, Студэнт, Вартаўнік, Салдат, Карчмар, а таксама галоўная міфалагічная істота нацыянальнага фальклору – Чорт. Пісьменнікі-парадысты паказвалі абыякавасць простага чалавека да рэлігійных абрадаў, яго кемлівасць і ўменне выйсці з складаных жыццёвых сітуацый.

У беларускай прозе XVIII ст. з’явіўся новы *тып героя* – гульца, авантурыста, выпрабавальніка лёсу. Новы герой прагнуў прыгодаў, нечаканых жыццёвых паваротаў. Ён імкнецца ў далёкія землі, на іншыя кантыненты, накіроўваецца ў падарожжы ў нязведаныя краіны, шукае новых уражанняў і яркіх падзеяў.

Галоўныя героі мастацкай літаратуры XIX стст. – працоўныя сяляне, карчмары і шынкаркі, леснікі і рыбакі, пастухі і арандатары, збяднелая шляхта і дробныя чыноўнікі. Пад уздзеяннем эстэтыкі Рамантызму і новых мастацкіх густаў беларускія пісьменнікі паказвалі побыт і ўнутраны свет простага чалавека, яго клопаты, мары і надзеі.

У галіне характаралогіі перад сучасным літаратуразнаўствам узнікаюць новыя задачы – выявіць комплекс мастацкіх сродкаў і асноўныя механізмы стварэння майстрамі слова яркіх герояў і персанажаў.

Пісьменнікі XI – XIX стст. звярнуліся да *архетыповых* вобразаў роднага краю, пры выкарыстанні якіх ўзмацняліся метафарызацыя і сімвалізм у літаратуры, што сведчыла пра ўзмацненне патэнцыялу мастацкага слова. Вельмі важна выявіць і раскрыць багатую семантыку нацыянальных архетыповых вобразаў, прасачыць працэсы сімвалізацыі і метафарызацыі ў нацыянальнай літаратуры.

Беларускай літаратуры даўняга часу ўласцівы *містыцызм*, адлюстраванне інфернальнага свету, таямнічых, загадкавых і неспазнаных з’яваў і рэчаў. У ёй пашыраліся сюжэты пра цуды і незвычайныя праявы абразоў Божай Маці, ад якіх дзіўным чынам вылечваліся хворыя і атрымлівалі дапамогу нямоглыя.

Вызначальная і прагрэсіўная тэндэнцыя развіцця і ўласна мастацкага сталення беларускай літаратуры XI – XIX стст. – зварот да *фальклору і нацыянальнай міфалогіі*, мастацкае асваенне, трансфармацыя і рэцэпцыя

здабыткаў беларускай народнай творчасці. Сапраўдны шэдэўр кніжнай паэзіі XVII ст. – "Лямант на смерць Лявонція Карповіча" М.Сматрыцкага – быў напісаны пад уздзеяннем народных галашэнняў. Славутыя "Баркулабаўская хроніка" і першы беларускі протараман – "Магілёўская хроніка" ўтрымлівалі каларытныя паданні, легенды і показкі. У XIX ст. пісьменнікі выявілі павышаную ўвагу да народных звычаяў, абрадаў, рытуалаў і вераванняў. Як вынік, у літаратуры гальванізаваліся працэсы асваення нацыянальнага меласу і народнага эпасу. У арыгінальныя мастацкія творы арганічна ўваходзілі народныя песні, паданні, легенды, прыпеўкі, прыказкі і прымаўкі. На старонках літаратурных твораў ажылі персанажы беларускага фальклору – ваўкалакі, русалкі, лесуны, духі і ведзьмы.

Майстры мастацкага слова нязменна звярталіся да сапраўды невычэрпнага скарбу – *народнай мовы*, выкарыстоўвалі ў мастацкіх творах трапныя словы і выразы, яркія параўнанні і выслоўі.

Комплекс фундаментальных праблем, што паўстаюць у плоскасці ўзаемадзеяння фальклора і літаратуры, кніжнай мовы і вусных гаворак несумненна патрабуе глыбокіх і спецыяльных даследаванняў, якія дапамогуць выявіць новыя грані пісьменніцкага майстэрства.

Перспектыўныя задача нацыянальнага літаратуразнаўства – з дапамогай герменеўтычнай, фенаменалагічнай і семіятычнай метадалогіі, адкрыццяў тэарэтычнай навукі [5], усебакова раскрыць уласна літаратурныя набыткі пісьменнікаў XI – XIX стст., паказаць тэхніку і прыёмы працы літаратараў над мастацкім словам, выявіць адметнасці мастацкага почырку і творчай індывідуальнасці кожнага з майстроў слова, іх уплыў на развіццё беларускай літаратуры XX ст. і сучасны літаратурны працэс. Паўнавартаснае асэнсаванне мастацка-эстэтычнага феномена беларускай літаратуры XI – XIX стст., аб'ектыўнае вызначэнне яе ролі ў духоўна-культурным жыцці грамадства паслужыць надзейным грунтам для імклівага развіцця нацыянальнай літаратуры ў XXI ст.

Актуальнымі для гісторыкаў літаратуры застаюцца мэтанакіраваныя *архіўныя* пошукі, праца ў кнігасховішчах, у якіх захоўваюцца старадаўнія рукапісныя кнігі і унікальныя друкаваныя помнікі.

Важны напрамак – *тэксталагічная* праца, узнаўленне спадчыны беларускіх пісьменнікаў. У галіне тэксталогіі найбольшую каштоўнасць уяўляюць факсімільныя выданні літаратурных помнікаў з навуковымі каментарыямі. Узорам можа служыць выданне "Апостала" Ф.Скарыны ў 2002 г. з навуковым суправаджэннем на нямецкай і англійскай мовах, якое, да таго ж, з'яўляецца праявай паспяховага экспарту на Захад беларускага інтэлектуальна-мастацкага прадукту [7].

Варта прадоўжыць падрыхтоўку і выданні твораў беларускіх майстроў слова ў перакладах на сучасную беларускую мову, рускую і замежныя мовы.

Неабходнасць вырашэння комплекса складаных задач літаратуразнаўчай навукі ставіць на парадак дня пытанне аб якасна новых патрабаваннях да спецыялістаў у галіне гісторыі і тэорыі літаратуры. Зусім відавочна, што сучасны літаратуразнавец павінен не толькі дасканала ведаць літаратурныя творы, перадусім, класічныя набыткі (нацыянальныя і замежныя), але і быць глыбока абазнаным у гістарычных і грамадскіх працэсах, ведаць культуру і рэлігію, валодаць сістэмнымі філасофскімі ведамі, добра арыентавацца ў такіх важных галінах мовазнаўства, як анамастыка і стылістыка. Менавіта на прафесіяналізацыю і глыбокія гуманітарныя веды мусяць арыентавацца сучасныя аспіранты і дактаранты, каб забяспечыць далейшы прагрэс літаратуразнаўчай навукі, выкананне яе сацыяльных функцый і высокай духоўна-гуманістычнай місіі.

**Літаратура:**

1.Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей. У 4 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993 – 1995.

2.*Лихачев Д.С.* Развитие русской литературы X – XVII вв. Эпохи и стили. Л.: Наука, 1973. – 253 с.

3.*Барычэўскі А.І.* Поэтыка літаратурных жанраў. Мн., 1927. – 263 с.

4.Беларуская літаратура XIX ст. Зборнік тэкстаў. Мн., 1940. – 254 с.

5.Беларуская літаратура XIX ст. Хрэстаматыя / Склад. С.Х. Александровіч, А.А.Лойка, В.П.Рагойша. Мн., 1971. – 372 с.

6.Weissrussland und der Westen. Dresden, 1998.– 219 s.

7.Biblija ruska. Apostol. Wilna, 1525. “Ferdinand Schoningh”. Paderborn – Zurich. 2002.